# Надзежда Грыгор'еўна Грэкава

Масква. Ужо не ў першы раз Надзежда Грыгор'еўна ішла па яе прыгожых вуліцах. Вось вуліца Горкага. А вось і Красная плошча, Крэмль —сэрца Масквы, сэрца ўсёй нашай вялікай Радзімы.

Усведамленне таго, што вось яна, — дачка калісьці самай беднай сям'і з Беларускай вуліцы, што ў Мінску,—ідзе зараз у Крэмль, хвалявала яе сэрца.

Шумнай авацыяй, поўнымі захаплення воклічамі сустрэлі свайго бацьку і настаўніка вялікага Сталіна дэлегаты XVIII з'езда партыі большэвікоў.

Ён падняўся на трыбуну. І, затаіўшы дыханне, большэвікі, што сабраліся сюды, слухалі яго гістарычны даклад. Кожны імкнуўся на ўсё сваё жыццё запомніць мудрыя словы Сталіна.

Надзежда Грыгор'еўна і цяпер успамінае гэтыя дні, гэтую сустрэчу з правадыром, як самыя шчаслівыя дні свайго жыцця.

Ішлі годы. Беларускія гарады і вёскі ўсё больш мянялі сваё аблічча. Канула ў мінулае беднасць, галеча. Стаўшы на шлях калгаснага жыцця, сялянства пазнала радасць творчай працы, палі закасіліся багатым ураджаем. І на Міншчыне, і на Палессі, на Віцебшчыне і Гомельшчыне—усюды свабодна працаваў совецкі чалавек, пажынаючы багатыя плады сваёй працы.

Беларусь ужо займала адно з перадавых месц сярод брацкіх рэспублік Совецкага Саюза і ў развіцці прамысловасці. Мінск Гомель, Віцебск, Магілеў і другія беларускія гарады станавіліся ў рад буйнейшых прамысловых цэнтраў краіны.

У гэтай вялікай творчай рабоце актыўнейшы ўдзел прымала Надзежда Грыгор'еўна Грэкава.

...Дачка чыгуначніка-кандуктара, Надзежда Грыгор'еўна свой працоўны шлях пачала швейніцай.

Дванаццацігадовай дзяўчынкай Надзежда паступае ў рамесніцкае вучылішча. У 1927 годзе яна ўжо самастойная работніца мінскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік». Яе, як лепшую ўдарніцу прадпрыемства,



хутка выбіраюць старшынёй цэхавага камітэта. Яна ўносіць многа каштоўных прапаноў па далейшаму развіццю працэсаў вытворчасці. Як чалавека з рабочай смякалкай, Надзежду Грыгор'еўну вылучаюць на работу загадчыка бюро вынаходства і рацыяналізацыі. Так праходзіць шэсць год напружанай работы Надзежды Грыгор'еўны. Яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод швейнікаў. Затым тав. Грэкава амаль пяць год працуе ў Цэнтральным праўленні саюза работнікаў швейнай прамысловасці, спачатку намеснікам старшыні, а затым і яго старшынёй.

У 1938 годзе працоўныя Веткаўскай выбарчай акругі выбіраюць тав. Грэкаву сваім дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР.

З 1937 па 1940 год Надзежда Грыгор'еўна працуе ў Цэнтральным Камітэце КП(б)Б спачатку ў аддзеле прамысловасці, а з 1938 па 1940 год—трэцім сакратаром ЦК КП(б)Б.

З 1940 года тав. Грэкава—слухач Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК ВКП(б), а з 1941 па 1943 працуе сакратаром казанскага гаркома партыі.

На першай сесіі першага склікання Вярхоўнага Совета БССР у 1938 годзе Надзежда Грыгор'еўна Грэкава была выбрана старшынёй Вярхоўнага Совета БССР.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. Грэкава была ўзнагароджана ў 1939 годзе ордэнам Леніна.

У годы Айчыннай вайны совецкага народа супроць нямецкіх захопнікаў тав. Грэкава вяла работу па аказанню дапамогі беларускім партызанам.

Нямецка-фашысцкія душагубы нанеслі глыбокія раны нашай рэспубліцы. Яны спалілі гарады, тысячы калгасных сёл і вёсак, разбурылі нашу прамысловасць, сельскую гаспадарку. І зараз Надзежда Грыгор'еўна ўкладвае многа сіл і энергіі ў справу хутчэйшага адраджэння нашай рэспублікі. За самаадданую работу тав. Грэкава ўзнагароджана ў 1944 годзе ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Верную дачку беларускага народа, члена ЦК КП(б)Б, старшыню Вярхоўнага Совета БССР Надзежду Грыгор'еўну Грэкаву працоўныя Рагачоўскай выбарчай акругі вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Васіль ЛЯЎКОЎ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ